*Літ.:* Сабинина М. Прокофьев // Музыка XX в. М., 1984. Ч. 2, кн. 4; Савкина Н.П. С.С.Прокофьев. М., 1982; Он всегда немножечко впереди народа // Сов. музыка. 1991. № 4.

*Л.А.Сівалобчык.*

**ПРАЛО́Г** (грэч. prologos ад pro перад + logos слова), уводная частка маст. твора, у якой паведамляецца пра падзеі, якія папярэднічаюць асн. дзеі або растлумачваюць аўтарскую задуму і змест твора. Структурна-функцыянальна сфарміраваўся ў ант. драматургіі як уступны маналог акцёра, звернуты да гледача, уводная сцэна, якая папярэднічала асн. дзеі п'есы і заклікана выкласці зыходныя пазіцыі фабульнай сітуацыі, растлумачыць міф, пакладзены ў аснову твора (Эсхіл, Еўрыпід, Плаўт і інш.). У адрозненне ад прадмовы П. мае маст. выяўл. дамінанту і тэндэнцыю да зліцця з сюжэтам. У 19—20 ст. П. усё больш змыкаецца з фабулай. У бел. драматургіі («Кар'ера таварыша Брызгаліна» Е.Міровіча, «Мілы чалавек» К.Крапівы, «У новым доме» І.Мележа, «Шпачок» А.Махнача і інш.) П. часам выступае як перадгісторыя, але часцей выкарыстоўваецца ў сваіх традыц. функцыянальна-выяўл. параметрах папярэдняга тлумачэння будучай дзеі, уводна-настраёвай эксплікацыі.

*С.С.Лаўшук.*

**ПРАСЦЭ́НІУМ** (лац. proscanium), пярэдняя, бліжэйшая да гледачоў частка *сцэны* перад *заслонай.*

**«ПРА́ЎДА ДО́БРА, А ШЧА́СЦЕ ЛЕПШ»**, камедыя *А.Астроўскага.* Напісана ў 1876. На Беларусі пастаўлена ў 1946 Бабруйскім абл. драм. т-рам. Рэжысёр М.Кавязін, мастак А.Марыкс. У ролях: Паліксена — А.Шах-Парон, Ю.Трахтэнберг; Барабошава — Р.Грузд, Філіцата — А.Халіна, Гразноў — М.Раманаў. У 1947 Кавязін паставіў яе ў Гродзенскім абл. драм. т-ры (мастак Марыкс). У 1950 п'еса ўвасоблена ў Бел. т-ры імя Я.Коласа. Рэжысёр М.Міцкевіч, мастак Я.Нікалаеў. У 1956 пастаўлена Бел. т-рам імя Я.Купалы. Рэжысёр А.Архангельскі, мастак М.Плахава. У ролях: Гразноў — У.Уладамірскі, Маўра Тарасаўна — В.Галіна, Філіцата — Л.Ржэцкая. У 1957 п'есу паставілі навучэнцы студыі т-ра імя Я.Купалы. Камедыю ставілі таксама аматарскія гурткі.

**ПРЖЫБЫ́ТКА** Міхаіл Іванавіч (2.2.1906, Мінск — 18.11.1973), дзеяч тэатра. Засл. дз. культ. Беларусі (1967). З 1925 працаваў у Бел. т-ры імя Я.Купалы рабочым сцэны, заг. машынна-дэкарацыйнага і канструктарскага цэхаў, гал. машыністам сцэны. Дасканала валодаў сваёй справай, умелы арганізатар творчага працэсу, зрабіў значны ўклад у тэхн. аснашчанасць сцэны. Выканаў дэкарацыі да спектакляў: «Жыццё кліча» У.Біль-Белацаркоўскага (1935), «Як яе завуць» М.Адуева, «Далёкае» А.Афінагенава, «Ваўкі і авечкі» А.Астроўскага (усе 1936).

*Л.І.Балыніна.*

**ПРО́ХАРАЎ** Уладзімір Васілевіч (н. 26.4.1945, г. Цюкалінск Омскай вобл., Расія), кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1976, кл. Я.*Глебава*). З 1981 выкладае ў муз. навуч. установах Мінска. Працуе ў розных жанрах. Аўтар музыкі да спектакляў, пастаўленых у лялечных тэатрах Беларусі: дзярж. т-ры — «Кошчын дом» С.Маршака, «Гадзіннік з зялюляй» С.Пракоф'евай, «Доктар Айбаліт» В.Карастылёва (усе 1980), «38 папугаяў» Р.Остэра (1985), «Церам-церамок» Маршака (1986); у абл. т-рах: Гродзенскім — «Сіндбад-марахол» Ю.Фрыдмана і В.Шульжыка (1981), «Насарог і Жырафа» М.Гюнтара (1983), «Кацяня па мянушцы Гаў» Остэра, «Калі рамонак расцвітае» Р.Москава, «Балада пра белую вішню» С.Клімковіч (усе 1984); Брэсцкім — «Збанок-гаварун» А.Абу-Бакара (1982), «Іншаземец у Рыме» В.Маслава (1985), «Кот у ботах» Г.Уладычынай (1986), «...Забыць Герастрата!» Р.Горына (1989); Мінскім абл. т-ры лялек «Батлейка» (Маладзечна) — «Прывітанне для мартышкі» Остэра (1990), «Казкі Несцеркі» А.Туравай (1991), «Свята Ражаство радасць прынясло» І.Сідарука (1992); а таксама да спектакляў у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі — «Бабскае царства» паводле Ю.Нагібіна (1984), «Іван-ды-Мар'я» У.Гольдфельда (1986).

*Т.Б.Варфаламеева.*

**«ПРЫБАЛТЫ́ЙСКІЯ ТЭАТРА́ЛЬНЫЯ ВЁСНЫ»**, гл. *Фестываль «Прыбалтыйскія тэатральныя вёсны».*

**ПРЫВАТНАЎЛА́СНІЦКІ ТЭА́ТР**, від дваранскага тэатра ў 18 — 1-й пал. 19 ст. Ствараўся пры дварах буйных магнатаў: Радзівілаў, Сапегаў, Зорычаў, Агінскага, Тызенгаўза. Існавалі 2 тыпы П.т.: маёнткавы — закрыты (з трупай пераважна аматараў, артыстаў, выканальніцтва якіх не вызначалася высокім прафес. узроўнем); гарадскі (местачковы) — адкрыты (акцёры з высокім прафес. узроўнем, набліжаным да сталічных тэатраў, на спектаклях прысутнічала дробная шляхта, прадстаўнікі разначынных колаў насельніцтва гарадоў; Нясвіж, Шклоў, Слуцк, Гродна, Слонім). Працавалі ў спец. тэатр. памяшканнях ці ў залах палацаў, ратуш і інш. Іх спектаклі першапачаткова неслі адбітак рэлігійна-схаластычных,



В.В.**Пражэева**.



С.С.**Пракоф'еў**.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

дыдактычных і алегарычных пастановак *школьнага тэатра*; паступова сталі выкарыстоўваць узоры замежнага мастацтва, скіроўвацца на асветніцкія погляды. Рэпертуар адлюстроўваў пераважна агульнаеўрапейскія праблемы, ішоў пераважна на франц., італьян., ням. і польскай мовах. Драм. спектаклі ставіліся рэдка, часцей балеты алегарычнага зместу, танцавальныя інтэрмедыі, апафеозы, пантамімы, дывертысменты, оперы, оперы-балеты, камічныя оперы, аперэты замежных кампазітараў. З арыгінальнай драматургіі — камедыі, трагедыі і оперныя лібрэта на польскай мове Ф.У.*Радзівіл*. Яе пераклад камедыі «Цудоўныя каханкі» Мальера на польскую мову («Убачанае не мінае») — першая пастаноўка твораў франц. класікі на бел. сцэне (14.6.1749). Акцёрамі былі пераважна прыгонныя сяляне. Іншы раз яны ўдзельнічалі ў паказах прыватных прафес. тэатраў (*Віцебскі балет Піёна, Гродзенскі тэатр Тызенгаўза*, тэатр Бжазоўскага ў Матэвушах, *Ружанскі тэатр Сапегаў, Слонімскі тэатр Агінскага, Чарнышова тэатры, Тышкевічавы тэатры*). У некат. спектаклях выступалі і вялікасвецкія аматары і прафес. акцёры. Бел. магнаты запрашалі не толькі добравядомых тагачасных прафес. акцёраў, музыкантаў, балетмайстраў і танцоўшчыкаў з Зах. Еўропы (Т.А.Г.Салмаран, І.А.Стэфані, Л.М.Дзюпрэ, Ф.Г. Ле Ду, К.Абатэ, К.Чыпрыяні і інш.), але і цэлыя тэатр. трупы з Італіі, Францыі, Аўстрыі, Польшчы. Пры П.т. працавалі школы, у якіх рыхтавалі артыстаў для тэатраў (*Гродзенская музычна-тэатральная школа Тызенгаўза, Слонімская балетная школа, Нясвіжская балетная школа, Слуцкая балетная школа*, Пастаўская балетная школа). Прафес. падрыхтоўка прыгонных артыстаў мела высокі ўзровень: цэлыя бел. трупы і капэлы пазней уліваліся ў склад сталічных тэатраў і аркестраў. Выпускнікі Слонімскай, Гродзенскай і Пастаўскай балетных школ сталі салістамі Каралеўскага балета ў Варшаве, танцоры са Шклова, музыканты з Горы-Горак былі прададзены ўладальнікамі ў Дырэкцыю С.-Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў. Асаблівым маст. узроўнем, тэматычнай разнастайнасцю вылучаліся П.т. Гродна, Ружан, Слоніма, Магілёва. Вял. ролю ў гісторыі тэатра адыгралі *Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, Слуцкі тэатр Радзівіла* і *Шклоўскі тэатр Зорыча*, якія мелі балетна-оперныя, драм. трупы, вял. аркестры, капэлы, тэатр. будынкі з добра абсталяванай сцэнай і развітай машынерыяй. Своеасаблівай тэатр. з'явай у пач. 19 ст. быў прыгонны тэатр Оштарпа ў Дукоры (Пухавіцкі р-н).

*Літ.*: Барышаў Г.І. Гарадскі і маёнткавы прыгонныя тэатры на тэрыторыі Беларусі // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1; Яго ж. Театральная культура Белоруссии XIII в. Мн., 1992.

*І.А.Алексніна.*

**ПРЫ́МА-БАЛЕРЫ́НА**, вядучая артыстка балетнай трупы, танцоўшчыца вышэйшай кваліфікацыі. Званне з'явілася ў Расіі ў канцы 19 ст. (пасля гастроляў італьян. артыстак В.Цукі, П.Леньяні, К.Брыянца і інш.). Напачатку было неафіцыйным, пазней прысвойвалася дырэкцыяй імператарскіх т-раў і замацоўвалася адпаведным акладам. У 2-й пал. 20 ст. традыцыйна П.-б. называюць артыстку, якая выконвае большасць цэнтр. і гал. партый, валодае непаўторнай своеасаблівасцю інтэрпрэтацыі роляў, высокай тэхнікай, артыстызмам. У інш. краінах паняцце «П.-б.» супадае з практыкай і традыцыямі рус. харэагр. тэатра.

**ПРЫМАДО́ННА** (італьян. prima donna першая дама), спявачка, якая выконвае галоўныя партыі ў оперы ці аперэце.

**ПРЭМ'Е́РА** (франц. première першая), першы публічны платны паказ новага ці аднаўленага спектакля, эстраднай ці цыркавой праграмы. Часта П. называюць рэпертуарную навінку тэатра.

**ПРЭ́МІІ ТЭАТРА́ЛЬНЫЯ** імянныя. Заснаваны ў 1992 Міністэрствам культуры Беларусі і Беларускім саюзам тэатральных дзеячаў. Прысуджаюцца раз у 2 гады за яркія творчыя дасягненні ў бел. тэатральным мастацтве: Прэмія імя Л.Александроўскай прысуджаецца артыстам і пастаноўшчыкам спектакляў муз. тэатраў. Узнагароджаны: **1992**. Н.Гайда. **1994**. А.Ранцанц. **1996**. Група салістаў балета «Страсці» (С.Гарбунова, У.Далгіх, І.Душкевіч, В.Захараў, Р.Мінін, Е.Фадзеева, Т.Шаметавец). **1997**. Н.Руднева. **1999**. Э.Пелагейчанка. **2001**. Т.Глаголева. Прэмія імя І.Буйніцкага прысуджаецца артыстам драм. тэатраў. Узнагароджаны: **1992**. Р.Янкоўскі. **1994**. А.Клімава. **1996**. І.Забара. **1997**. Т.Кокштыс. **1999**. С.Журавель. **2001**. М.Кірычэнка. Прэмія імя Е.Міровіча прысуджаецца рэжысёрам, драматургам, сцэнографам, кампазітарам, балетмайстрам. Узнагароджаны: **1992**. Б.Герлаван. **1994**, **1999**. М.Пінігін. **1996**. В.Елізар'еў. **2001**. А.Андросік. Прэмія імя Л.Мазалеўскай прысуджаецца за творчыя дасягненні ў галіне тэатр. мастацтва для дзяцей. Узнагароджаны: **1992**. Ал.Ляляўскі, А.Фаміна, У.Кандрусевіч. **1994**. А.Жугжда, А.Сідараў. **1996**. Ю.Вута. **1997**. У.Караткевіч. **1999**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ